


## У НУМАРЫ

| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
| --- | --- |
| **Кніга водгукаў**<br>**Успаміны і персаналіі**<br>**Правядзенне святочнай праграмы "Расхіні душу, гармонік!"**<br>**Выставачны праект "Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст."**<br>**У музеі здымаюць кіно**<br>**Нішто не заменіць сам артэфакт у музеі, але…** | **Абразы на Беларусі: нарыс-замалёўка**<br>**Заслаўе ў беларускай культуры** |

## ***Навіны***

### Кніга водгукаў

**2022**

"Спасибо всем сотрудникам! Г. Тверь. Россия с любовью!" (сем'і Камароўскіх і Аўчаровых, Расійская Федэрацыя, 4 студзеня).

"Спасибо за чудесную экскурсию. Желаем успехов в деле музея" (вучні 3 "б", гімназія №25 г. Мінска, 12 студзеня).

"Чудесная экскурсия с Тамарой Андреевной Гудыно! Время пролетело незаметно. Спасибо большое за внимание к детям!.." (госці з Мінска, 22 студзеня).

"Выражаем благодарность за интересную, познавательную и увлекательную экскурсию. Желаем развития, процветания и успехов. Здоровья и Мира! Спасибо!" (прыход храма г. Мінска св. Мікалая Японскага, 29 мая).

“Коллектив БелАЗа выражает слова признательности Анне Ильиничне *[Гарбачонак – рэд.]* за очень познавательную экскурсию…Побольше благодарных экскурсантов!!!” (4 чэрвеня).

“Дзякуем за працу! Жадаем росквіту, цікавых падзей, экспанатаў і наведвальнікаў! Вялікі дзякуй за выставу “АСОБА” Анастасіі Балыш, таму што гісторыя краю і краіны – гэта людзі, іх жыццёвы шлях, адносіны да сям’і, працы і месца! Шанаваць сваё – наша Нацыянальная ідэя!” (Таццяна Караткевіч, 25 чэрвеня).



*Кніга водгукаў музея-запаведніка,*
*якая захоўваецца ў музейна-выставачным комплексе*

“Всего наилучшего” (ІПС – Інстытут пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, 24 ліпеня).

“Сердечно благодарим за экскурсию на городища “Замэчак”, “Вал” и экскурсию в музее. Светлый и радостный настрой, тихий свет. Спаси вас Христос! Храните и расширяйте вашу экспозицию во Славу Святой Троицы, во спасение души людей” (паломнік Дзімітрый і сестры, 28 ліпеня, свята 1030-годдзя хрысціянства на беларускіх землях).

“Огромная благодарность сотрудникам музея за интересную композицию, приятную атмосферу, и спасибо большое сотруднице музея Анне Ильиничне *[Гарбачонак – рэд.]* за профессионализм, доброжелательное отношение, умение развивать интерес посетителей к истории Беларуси” (госці музея Аліна Міхайлаўна і Людміла Уладзіміраўна, 20 жніўня).

“Огромную благодарность выражаем сотрудникам музея. С уважением, посетители из 98 школы г. Минска” (6 верасня).

“Коллектив ГУО “Гимназия №3 г. Молодечно”, “Гимназия №7 г. Молодечно” выражаем благодарность коллективу музея за содержательную экскурсию и приятную атмосферу. Было очень интересно и познавательно” (1 кастрычніка).

*[на гэтым рубрыка “Кніга водгукаў” часова спыняецца, з той нагоды, што падборка водгукаў з 1994 па 2022 гг. ужо пабачыла свет на старонках нашай газеты ў №№ 2-30 – рэд.]*

## Успаміны і персаналіі

*Працягваем друк успамінаў Аляксандра Калбаскі (пачатак у №9). Дадаткова адзначаем, што матэрыял, адлюстраваны ва ўспамінах, цэласна сфармаваўся ў 1999-2000 гг., таму не ўсе закранутыя ў ім аспекты могуць цалкам адпавядаць сённяшняму бачанню спецыялістаў музейнай справы. Матэрыял друкуецца фактычна без зменаў (або з мінімальнымі), апрача, галоўным чынам, захадаў скарачэння аб'ёму [рэд.]*.

***<u>Як пачыналася</u>***

**МУЗЕЙНЫ НАВІГАТАР,**

**ЦІ ПАРАДЫ МУЗЕЙНАГА ДЫРЭКТАРА**

### Англа-беларускі музейны слоўнічак

*Слоўнічак гэты ёсць вынік працы па перакладу паасобных англамоўных артыкулаў, ні ў якім разе не прэтэндуе на завершанасць, а вымагае пашырэння і працягу.*

Admission charge – уваходная плата
Activity – актыўнасць
Acquisition form – акт прыема
Acquisition – набыцце
Admission fee – уступны ўнёсак
Allocation – размеркаванне
Alteration – перамена
Animation – ажыўленне
Appliance – прыстасаванне

Appendage – дадатак
Assembly – збор
Assessment – ацэнка
Auditorium – аудыторыя

Barn – пуня
Being processed – знаходзіцца ў апрацоўцы
Bequest – перадача ў спадчыну




*Аляксандр Калбаска.*
*Прэзентацыя кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя”, 2000 г.*

Campaigns – захады
Case – вітрына
Chamber of treasures – пакой каштоўнасцяў
Charity – дабрачыннасць
Circulation, circuit – кругазварот
Cloakroom – гардэроб, камера захавання
Collect – збіраць
Community – мясцовае насельніцтва
Consideration – асэнсаванне
Corporate – ведамасны
Curiosity – дзіва, дзівосы
Custody – захаванне

Data – інфармацыя
Decontamination – ачыстка

Deposits – часовае захаванне
Designation – вызначэнне
Deteriorate – псаваць, пагаршаць
Devise – вынаходніцтва
Direction signing – паказальнікі накірунку руху
Dismantling – дэмантаж
Donation – ахвяраванне

Elementary technology – першасная апрацоўка
Educational activities – адукацыйная дзейнасць
Endoument – надзел
Estimate – ацэньваць
Expenditure – выдаткі
External sign – знешнія абвесткі
Exchanges – абмен
Evaluate – ацэньваць
Evidence – сведчанне, доказ
Facility – умовы, зручнасці

Files – картатэкі
Folder – пакет
Forgery – падробка
Framework – формы
Fund raising – пошук фінансавых фондаў
Furnace – горн

Granary – свіран
Guide – экскурс

Handicapped visitors – наведвальнікі з фізічнымі недахопамі
Handling – дастаўка
Historic site – гістарычная мясціна
Historical simulation – гістарычнае мадэляванне
Hot chambers – тэрмакамеры
Heimatmuseum (з ням.) – музей бацькаўшчыны
Heeresmuseum (з ням.) – вайсковы музей

Inanimate – неадухаўлённыя
Inventory – вопіс
Item – нумар, пункт, прадмет

Label – этыкетка
Layout – планіроўка

Liaison – пасярэднік
Living history farm – ажыўленая гістарычная ферма
Living history – ажыўленая гісторыя
Living history museum – ажыўлены гістарычны музей
Legislation – заканадаўства
Loan – пазыка

Martur – пакутнік
Maintenance – утрыманне
Miscellaneous – разнабаковы, змешаны
Molding – планка
Mounting – мантаж
Movie theatre – відэазал
Museum extension – музейная папулярызацыя

Open air museum – музей пад адкрытым небам
Operation – дзейнасць, функцыянаванне
Origin – крыніца
Outdoor museum (USA) – музей пад адкрытым небам

Pamphlets – буклет
Public relations – адносіны з публікаю
Publicity – рэклама
Purchase – закупка, набыццё
Purpose – сутнасць
Postcard – паштоўка
Projection room – пакой для прагляду
Pollution – забруджванне
Promotion and marketing – прасоўванне паслуг на рынак
Property – маёмасць

Rarities – рэдкасці
Reception – атрыманне
Related records – прадстаўленае апісанне
Repair – аднаўленне
Replicas – дакладная копія
Responsibility – адказнасць
Restriction – абмежаванні
Retrieval – пошук

Safety – захаванасць
Sale counter – гандлёвая кропка

Sample – узор
Schedule – схематычны план, графік
Security – бяспека
Service – служба, паслуга
Set up – стварэнне, размяшчэнне
Setting goals – вызначэнне мэт
Shipment – размяшчэнне
Significance – значнасць
Specimen – узор, асобнік
Storyline – фабула
Supervision – нагляд,
Survey – агляд
Survey questionnaires – аглядныя апытальнікі
Syllabus – вучэбны план

Tab – этыкетка
Temple – храм
Temporary – часовы
Tomb – магіла, надмагільны помнік
Touring exhibitions – экскурсавядзенне
Treatment – апрацоўка
Trustees – папячыцельскі савет

Unit or authority – адзінка ці ўпраўленне

Workshop – майстэрня

Venerate the past – ставіцца з павагаю да мінулага
Visitor – наведвальнік

*Аляксандр Калбаска, прафесар ЕГУ,*
*дырэктар Запаведніка ў 1988-1994 і 1997-2000 гадах,*
*aliaksandr.kalbaska@ehu.lt*

*[на гэтым завяршаем друк успамінаў А. Калбаскі ("Дыярыуша"), які быў распачаты ў №9 – рэд.]*

**Правядзенне святочнай праграмы "Расхіні душу, гармонік!"**

Да Дня людзей сталага веку ў нашым музеі-запаведніку была праведзена святочная праграма-вечарына "Расхіні душу, гармонік!"

Праводзілася яна 2 кастрычніка ў экспазіцыі “Музыка вячорак” музейна-выставачнага комплекса на бясплатнай аснове.

Гасцямі вечарыны былі не толькі людзі сталага веку, але і моладзь. Госці, разам з нашымі супрацоўнікамі, спявалі, развучылі гульню “Свінні ў рэпе” і танец “Кракавяк”, гралі на шумавых музычных інструментах.



На гармоніку грае наш супрацоўнік Барыс Харэвіч
(фота аўтарства Ганны Гарбачонак)



Ідзе свята. Першай злева сядзіць наша супрацоўніца Тамара Гудына, побач з ёю наша былая супрацоўніца – Галіна Мянькоўская і госці праграмы-вечарыны
(фота аўтарства Ганны Гарбачонак)

Супрацоўнікі музея-запаведніка зрабілі ўсё магчымае для стварэння па-хатняму лагоднай сяброўскай атмасферы – і гэта сапраўды атрымалася: весялосцю свяціліся твары гасцей, якія ахвотна ўдзельнічалі ва ўсіх прапанаваных актыўнасцях, шчыра дзякавалі за радасць і добры настрой, якія забралі ў душы  з сабою.

**Выставачны праект “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. ХХ ст.”**

21 кастрычніка – 24 снежня 2022

*Княства… Графства… Воласць…* ***Заслаўскі раён****…* зноўку “*Воласць*” і зноўку ***Раён****…*

*Кіеўская Русь… Вялікае Княства Літоўскае… Рэч Паспалітая… Расійская імперыя… БНР… ССРБ… ЛітБел… ІІ Рэч Паспалітая… БССР… СССР… Генеральная акруга Беларусь Рэйхскамісарыяту Остланд*… аднаўленне *БССР* і *СССР… Рэспубліка Беларусь…*

Тысячагадовая гісторыя *Заслаўя* дый *Земляў Заслаўскіх* — у розныя часы дый у розных краінах. Розныя абшары ды розныя статусы. Вывучаць заслаўскую гісторыю можна толькі па гісторыі гэтых абшараў ды па іх назвах. Дый гісторыю самой Беларусі, якая бы ў люстэрку тут адбілася — усю мінуўшчыну краіны дый цяперашні час можна зразумець, зірнуўшы ў тое мінулае.



Выставачны праект “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. ХХ ст.”
(агульны выгляд, фота аўтарства Ксеніі Сямашка)

Так, у мінулым XX стагоддзі даўжэй за ўсё Заслаўе “ўваходзіла” ў БССР ды ў СССР, які быў утвораны акурат сто гадоў таму — дамова аб утварэнні Савецкага Саюза была падпісана 29 снежня 1922 года.

А большасць часу, што нашае мястэчка было ў складзе БССР-СССР — з 1924 па 1959 гады, — існаваў і Заслаўскі раён. Толькі ў канцы 1950-ых гадоў у чарадзе акцый па ўзбуйненню ды рэфармаванню *адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак т*агачаснай Беларусі раён быў ліквідаваны.

*1920-ыя…*
*1930-ыя…*
*1940-ыя…*

Дый, урэшце *1950-ыя* — даўгія, ужо далёкія ад нас, але ж значныя, цікавыя, таямнічыя… Зусім іншыя, не падобныя на нашае жыццё, яны, насамрэч, яшчэ жывуць зыркімі ўспамінамі ў памяці месцічаў, у сямейнай гісторыі ды вобразах, што паўстаюць пры выгуку “*Заслаўе*”…

Паглядзець на тыя ўспаміны і *ўглядзецца* ў тыя чатыры дзесяцігодкі, што прайшлі ў жыцці мястэчка як *Заслаўскі раён БССР–СССР*, можна не толькі праз уласныя памяткі, праз успаміны блізкіх, але і праз пэўныя артэфакты, да якіх можна дакрануцца, якія можна агледзець, якія можна адчуць тактыльна, а ў музеі — можна нават і трошку медытаваць поруч з імі.

Пасля ліхалеццяў Першай сусветнай вайны, Першай рускай рэвалюцыі, тэрору Грамадзянскай і Савецка-Польскай войнаў ды ваеннага камунізму настаў мірны час. Але жыццё памежнага Заслаўскага раёну не было *мірным* і тады. Не толькі кампаніі раскулачвання і палітычных чыстак узрушвалі жыццё абываценляў. Гэты самы памежны рэжым вызначаў будзённасць усіх жыхароў раёна, нават тых, што жылі ў самых аддаленых ад граніцы яго частках. Кантрабандысты рызыкавалі дзеля прыбытку, а памежнікі, змагаючыся з імі дый ахоўваючы мяжу ад *варожых імперыялістычных нападак*, імкнуліся кантраляваць жыццё ўсіх заслаўскіх месцічаў, збіраючы *аператыўную інфармацыю* і робячы *аналітычны агляд сацыяльна-эканамічнага стану* жыцця раёна.

Але ж усё адно адкрываліся школы — *руская*, *габрэйская*, *беларуская*. Працавалі шпіталі і лякарні, праводзіліся сельгасвыставы, праводзіліся культурныя імпрэзы… Жыццё віравала і мінала скрозь па-/ваеннае ліхалецце. Праўда, суворы сталінскі *рэжым* не мог не пакінуць на ім свае адбіткі… Пра ўсё гэта нам сведчаць архіўныя дакументы і фатаграфіі з фондаў нашага Музея-запаведніка і Дзяржархіва Мінскай вобласці.

Пра ваенныя гады — нястачы, роспач дый гора таго ліхалецця, — многа разоў ужо ўзгадвалі мы ў сваёй музейнай рабоце. Але ж і звычайнае штодзённае жыццё было і ў ваенныя гады. Яно было нягледзячы ні на што, яно віравала. Але ж якім чынам яно *віравала*? Як жылі простыя людзі, як было арганізавана іх жыццё — іх “шэрыя будні”? Пра гэта таксама можна даведацца з архіўных дакументаў.

Разбураныя вайной, а дзесь і захаваныя хацінкі, спаленыя вёскі, спляжаныя гмахі пасля вайны адбудоўваліся, адбудоўвалася і жыццё людзей, ствараліся новыя *прадпрыемствы* ці аднаўлялі работу *старыя*… Адбіткі з нарысамі таго паваеннага жыцця 1940–50-ых гадоў таксама можна паглядзець на нашай выставе.

Ці было яно сапраўды такім радасным, як на тых фота, ці насамрэч прамянілася радасцю жыццё заслаўчан, як можна падумаць, разглядаючы тыя *пастановачныя* фота? Адказ могуць даць толькі самі гісторыі жыцця нашых месцічаў, іх успаміны, *мемуары*… Паглядзець на фотаздымкі можна на выставе, а паслухаць успаміны можна, выйшаўшы на вуліцы мястэчка — яшчэ багата тых людзей, якія самі перажылі паваенныя часы ў Заслаўскім раёне ды на ўласныя вочы бачылі яго паваеннае аднаўленне…

Блізкасць райцэнтра да Мінска абумовіла і яго арыентацыю на сталіцу, а, значыцца, і знікненне раёну ў 1950-ыя гады — гады імклівага аднаўлення *Галоўнага Горада Беларусі*. У канцы 50-ых раён *скасавалі*, але ж само *Заслаўе* з *Заслаўскімі абшарамі* засталося тут, на месцы. Толькі гэта ўжо іншая гісторыя — гісторыя Заслаўя і яго абшараў, што пісалася на нашыя ўласныя вочы…

Выстава не доўгатэрміновая, але гэта — адна з магчымасцяў даведацца пра гісторыю Заслаўя. Гісторыю мястэчка, якое сёння з’яўляецца турыстычнай мекай прысталічча, і гісторыю, якую не пачуеш падчас аглядных экскурсій — не таму, што яна складаная і ў чымсьці не вельмі прывабная, а таму, што ў маштабах гістарычнай спадчыны Заслаўя гэта зусім невялічкі прамежак часу… Усяго 100 год у складзе БССР–СССР, 35 год існавання Заслаўскага раёну. Але гэта час вялікіх змен і пераўтварэнняў…

*Ксенія Сямашка і Генадзь Сівохін –*
*ст. навуковыя супрацоўнікі музея-запаведніка,*
*аўтары апісанага вышэй Праекта*

## У музеі здымаюць кіно

На этнаграфічным комплексе нашага музея-запаведніка ўвечары 26-га кастрычніка РУП “Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм” здзяйсняліся здымкі эпізодаў фільма “Мы едины” (кінарэжысёр-пастаноўшчык – Андрэй Хрулёў; галоўны герой (персанаж) фільма – Павел Бойка).



Позневечаровыя кіназдымкі на этнаграфічным комплексе. Млын
(фота аўтарства Аляксандра Рака)



Позневечаровыя кіназдымкі на этнаграфічным комплексе. Хата “завознікаў”
(фота аўтарства Аляксандра Рака)

Згодна з інфармацыяй ад кінастудыі “Беларусьфільм”, дадзены фільм прысвечаны міжваеннай гісторыі нашай краіны, таму часу, калі Беларусь была падзелена на Усходнюю і Заходнюю, паміж БССР і Польшчай. У фільме адлюстроўваецца жыццё простых людзей, якія апынуліся ва ўмовах падзелу краіны паміж рознымі дзяржавамі.

Дапамогу ў позневечаровых здымках аказвалі нашы супрацоўнікі: Людміла Дакука (наглядчык) і Аляксандр Рак (галоўны захавальнік фондаў).

**Нішто не заменіць сам артэфакт у музеі, але…**

Сапраўдны музейны прадмет у нашай музейнай экспазіцыі — пэўны артэфакт, які непасрэдна сведчыць нам пра падзеі мінулага Заслаўя, пра канкрэтных асоб з гісторыі роднага мястэчка, — нішто і ніколі не зможа замяніць. Будзе гэта экспазіцыя пастаянная ці то кароткачасовая выстава — месца і роля сапраўдных помнікаў мінуўшчыны ў музеі неаспрэчная.

Іншая справа, што раскрыць, паказаць і данесці да наведвальнікаў тыя сведчанні, таямніцы і *сакрэты* ці то сівой даўніны, ці то падзей, блізкіх да нас па часе, якія хавае ў сабе гэты самы музейны артэфакт, той *сам па сабе* не здатны — за выключэннем некаторых адмыслоўцаў, рэдка хто можа “прачытаць” яго без дадатковай дапамогі.

І такой дапамогай звыкла выступае **граматна** арганізаваная работа музейных экспазіцыянераў і педагогаў: уводныя тэксты з этыкеткамі дапамогуць даведацца пра *гэты маўклівы аб’ект жадання* “асноўную” інфармацыю, а экскурсавод заўжды можа *паглыбіць* ды *пашырыць* веды дадатковымі звесткамі ды “гістарычнымі даведкамі”, адаптаваўшы тыя да патрэбы ў наведвальнікаў — будуць то дзеткі ці дарослыя, экскурсанты са зборных груп ад турбюро ці сяброўская дэлегацыя калегаў…

Іншая — ужо не новая, але не вельмі распаўсюджаная на Беларусі, — форма работы з выставачнымі праектамі дый з самімі музейнымі прадметамі — гэта стварэнне да выставаў мультымедыягідаў. У нас часцей можна спаткаць аўдыягіды да сталых экспазіцый, а вось скарыстацца з мультымедыягіда, дый на часовых, тым больш кароткатэрміновых выставах, у беларускіх музеях можна рэдка. І яно зразумела — збіраецца агромністы аб’ём інфармацыі і праводзяцца дадатковыя даследаванні да кароткатэрміновых экспазіцый. Але пасля заканчэння выставы ўсё сыходзіць у забыццё. Аднак адной з такіх магчымасцяў стаў праект нашага Музея-запаведніка “Аўта/Партрэт Рэканструктара”.

26 жніўня 2022 г. у музеі распачаў работу мемарыяльны экспазіцыйна-выставачны праект-акцыя “Аўта/Партрэт Рэканструктара”. Праект быў

рэалізаваны Музеем-запаведнікам сумесна з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва ў рамках серыі навукова-даследчых экспазіцыйна-выставачных праектаў “Этнаграфіка рэчавіду” і прымеркаваны да 85-іголдзя з дня нараджэння і 20-іголдзя — са дня смерці мастака і культурнага дзеяча Яўгена Куліка (пра выставу нашы чытачы маглі даведацца ў ранейшых нумарах).

Да міні-выставы, якая ўдала змясцілася ў зале габеленаў музейна-выставачнага комплекса музея-запаведніка і стала выдатным яе дадаткам-дапаўненнем, куратарамі быў распрацаваны мультымедыя-гід на базе сервіса izi.TRAVEL.

Медыя-гід прадстаўляе з сябе пяць калекцый, у якіх тэматычна змешчаны прадметы з выставы, а таксама лічбавыя копіі асабістых дакументаў Я. Куліка, прадстаўленыя Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва. Да кожнай калекцыі і кожнага прадмета падрыхтаваны і размешчаны дадатковыя тэксты, створаныя на аснове публікацый археолага Ю.А. Зайца з манаграфіі “Заславль в эпоху феодализма” і энцыклапедычнага выдання “Архітэктура Беларусі”. Куратарамі праведзена фотафіксацыя прадметаў археалогіі з музейнага збору для размяшчэння выяў ў медыя-гідзе.

Калекцыя “*Аўта/Партрэт Рэканструктара” экспазіцыйна-выставачны праект”* змяшчае звесткі пра Яўгена Сяргеевіча Куліка.

Калекцыя “*Археалагічная калекцыя старажытнага Заслаўя*” змяшчае пяць *экспанатаў*: “Бранзалеты” (апісанне і 9 фотаздымкаў); “Гарнітуры наборных баявых паясоў. Накладкі і наканечнікі” (X – пачатак XI ст.) (апісанне і 4 фотаздымкі); “Каралі” (апісанне і 10 фотаздымкаў); “Пярсцёнкі і скроневыя колцы” (апісанне і 8 фотаздымкаў); “Наканечнікі стрэл ад лука, арбалета і дзід” (апісанне і 6 фотаздымкаў).

Дзякуючы архіўным дакументам Яўгена Куліка, нам вядома, што ён даволі пільна сачыў за адкрыццямі ў археалагічнай навуцы. Захаваліся — і яны дэманстраваліся на выставе, — замалёўкі прадметаў упрыгажэння, адзення, абутку і галаўных убораў з раскопак з розных рэгіёнаў Беларусі, у тым ліку – і з Заслаўя.

Гарнітуры наборных баявых паясоў, накладкі і наканечнікі, бранзалеты, пярсцёнкі, скроневыя кольцы, наканечнікі стрэл ад лука і арбалета, якія вы бачыце на выявах былі знойдзены на тэрыторыі Заслаўя і перададзены Юрыем Апанасавічам Зайцам, кіраўніком заслаўскай экспедыцыі, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі ў Музей-запаведнік.

Калекцыя “*Малюнкі-рэканструкцыі Заслаўя і яго месцічаў*” складаецца з трох блокаў: “Рэканструкцыя адзення” (апісанне і 5

фотаздымкаў рэканструкцый Я. Куліка са збору Музея-запаведніка); “Рэканструкцыя адзення/Даследаванні і замалёўкі” (апісанне і 14 лічбавых копій з асабістай калекцыі Я. Куліка з Архіва); “Рэканструкцыя “Замачка” (апісанне і 1 фотаздымак рэканструкцыі Замачка са збору Музея-запаведніка).



*На фотакалажы музейныя прадметы з калекцыі археалогіі са збору Музея-запаведніка*

Работы мастака створаны алоўкам і тушшу на паперы ў 1985 годзе. Заслаўскае гарадзішча “Замачак” — крэпасць, якая выконвала ролю вайсковага і адміністрацыйнага цэнтра акругі. У ёй жа знаходзілася рэзідэнцыя княскай адміністрацыі, тут некалькі гадоў жыў Ізяслаў з Рагнедай. Мастацкімі сродкамі Я. Кулік падкрэсліў значнасць гэтага помніка археалогіі і перадаў яго на сваім малюнку як цэнтр свету, да якога ўсё імкнецца — і расліны і конніца.

Вобразная рэканструкцыя жыхароў Заслаўя прадстаўлена ў 5 творах майстра. “Рэканструкцыя ўбору і ўпрыгожанняў жыхаркі Заслаўя X – XI ст. паводле курганных археалагічных знаходак” — аўтарскай рукой падпісаны адзін з малюнкаў.

Паводле задумы куратараў выставы, у шкляных вітрынах можна пабачыць археалагічныя знаходкі з Заслаўя, іх жа наведвальнік бачыць і на малюнках Куліка. Гэта бранзалеты, каралі, пярсцёнкі, наканечнікі стрэлаў і дзід.

Акрамя таго, што тут можна пабачыць выявы работ са збору Музея-запаведніка, у гэтай калекцыі далучаны лічбавыя выявы замалёвак і малюнкаў Куліка са збораў Архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Калекцыя “*Малюнкі-рэканструкцыі (міні-лінарыты)*” складаецца з 10 экспанатаў — міні-лінарытаў з серыі “Помнікі дойлідства Гродзеншчыны” (1974) са збору Музея-запаведніка. Да кожнага малюнка-рэканструкцыі дададзена апісанне архітэктурнага аб’екта і выявы (фотаздымкі) аб’екта, якія дапамогуць больш дакладна разглядзець помнік.

Канец 1970-ых − 1980-ыя гады — гэта перыяд станкавай графікі гістарычнай, культурна-этнагарафічнай тэматыкі ў творчасці мастака. Творы выкананы ў розных стылявых манерах, але з характэрнай для Яўгена Сяргеявіча выяўленчай пластыкай, колеравай стрыманасцю, пэўнай манументалізацыяй вобразаў.

Серыя міні-лінарытаў “Помнікі дойлідства Гродзеншчыны” (1974) і каляровых малюнкаў-рэканструкцый “Замкі Беларусі” (1977) — гэта вынік этнаграфічных вандровак па Беларусі, здзейсненых Я. Кулікам разам з аднадумцамі.

Калекцыя “*Рэканструкцыя Яўгена Куліка*” складаецца з лічбавай копіі “Прапановы па развіццю музеяў у Беларускай ССР”, распрацаванай Яўгенам Кулікам, Міхалам Дубянецкім, Міколам Купавам і іншымі. Прапановы і шэраг іншых дакументаў прадстаўлены ўстановай “Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва”.

Наведвальнікі музея, даследчыкі і ўсе зацікаўленыя мелі магчымасць скарыстацца медыя-гідам падчас работы выставачнага праекта. Для тых,

хто не меў магчымасць наведаць Музей-запаведнік, гід даступны віртуальна па наступнай спасылцы: https://izi.travel/ru/browse/bec7a63b-9389-49fe-9ac1-acff78c48595?passcode=whfxna

Выстава працуе да 6 лістапада 2022 г.

*да друку падрыхтавана ст. навуковымі супрацоўнікамі музея-запаведніка*
*Генадзем Сівохіным і Ксеніяй Сямашка*

**Навуковая праца**

**Абразы на Беларусі: нарыс-замалёўка**

Абраз як адзін з відаў рэлігійнага жывапісу заставаўся найбольш распаўсюджаным у духоўным жыцці людзей на працягу некалькіх стагоддзяў.

Яго ўшаноўвалі, перад ім чыталіся малітвы. Абраз з'яўляўся культавым прадметам, які праецыраваў духоўную сувязь паміж чалавекам і Богам. Звяртаючыся да Бога з просьбай, пакаяннем, чалавек звяртаўся да абраза, які павінен быў "чуць" яго словы і не толькі чуць, але і дапамагаць ажыццяўляць тое, да чаго быў звернуты позірк чалавека.



*Маці Божая Замілаванне з Маларыты (XIV ст.), месцазнаходжанне абраза невядомае*

Станаўленне беларускай іканапіснай школы належыць да XV — XVI стст. Менавіта ў гэты перыяд мясцовыя ізографы, засвоіўшы еўрапейскую

тэхналогію пісьма і традыцый, набылі свой нацыянальны, адметны стыль напісання абразоў. Пад уплывам рэнесансавых ідэй у беларускім іканапісе назіраюцца пэўныя зрухі: на змену вытачаных і ўмоўных вобразаў, адарваных ад рэальнасці, прыходзіць канкрэтнасць, гармонія, дасканаласць прапорцый, пластычнасць. Біблейска-іканаграфічная аснова спалучаецца з рэальнасцю вобразаў, іх прастанароднасцю, этнаграфічнымі элементамі.



*Маці Божая Адзігітрыя Смаленская, к. XV ст., фрагмент, захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі*



*Маці Божая Ерусалімская XVI ст., Варварына царква, Пінск, знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі*



*Абраз “Пакланенне вешчуноў” з Дрысвят, Браслаўскі раён, XVI ст. З’яўляецца часткай збору музея Старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАНБ у Мінску*



*Параскева Пятніца са Случчыны, др.пал. XVI ст., знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі*

Самымі раннімі сярод знойдзеных на Беларусі мясцовых тыпаў абразоў з'яўляюцца: Маці Божая Замілаванне з Маларыты (XIV ст.), – Маці Божая Ерусалімская з пінскай Варварынскай царквы (XV ст.), а таксама з рысамі Адраджэння – Маці Божая Смаленская з Дубінца (канец XV ст.), Пакланенне вешчуноў з Дрысвят, Параскева Пятніца са Случчыны і інш.

Пісаліся абразы на сасновых, ліпавых альбо дубовых высушаных дошках таўшчынёю ад 2 да 3 см, падклееных ільняной ці пяньковай

тканінай. Для беларускіх абразоў разглядаемага часу адметным з'яўляецца шырокае выкарыстанне дэкаратыўна-пластычных сродкаў: разьбы, лепкі, афарбоўкі фону, разнастайных накладных элементаў, пакрыцця жывапіснай паверхні ахоўным лакам з яечнага бялку альбо смалы. У адрозненне ад станковага жывапісу іканаграфія арганічна ўваходзіла ў адзіны ідэйна-мастацкі комплекс з архітэктурай, дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам і выконвалася звычайна для канкрэтнага месца – ансамбля іканастаса ў праваслаўных і каталіцкіх храмах.



*Багамацер Усяпетая, к. XIX — пач. XX ст., абраз адносіцца да іканаграфічнага тыпу “Замілаванне”, захоўваецца ў гісторыка-культурным музеі-запаведніку “Заслаўе” (фота аўтарства Ірыны Арцем'евай)*

У фондах гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе” знаходзіцца больш за 100 абразоў канца XIX — пачатку XX ст., сярод якіх сустракаецца нямала абразоў з лікам Божае Маці.

*Літаратура:*


*1. М.П. Саўко, М.А. Бобер , В.І. Карнацкая “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі”, Мінск: БДМУ. 2003*

*2. Іканапіс Беларусі XV-XVIII ст., Мінск, Беларусь, 1994 г.*



*Вольга Зезетка,*
*супрацоўніца навукова-экспазіцыйнага аддзела*
*музея-запаведніка*

**Заслаўе ў беларускай культуры**

Многія мясцовыя жыхары і госці Заслаўя яшчэ маюць у сваіх успамінах згадку пра тое, што ў будынку сучаснага Кафедральнага сабора Праабражэння Гасподня ў Заслаўі (помнік архітэктуры другой паловы XVI – пачатку XVII стст., гісторыка-культурная каштоўнасць 1-й катэгорыі) пэўны час размяшчаўся музей. Людзі згадваюць пра вялікую колькасць аўтобусаў з турыстамі побач з гэтым музеем, пра нейкія асобныя экспанаты, якія іх уразілі, высокую вежу, па прыступках якой было нялёгка падняцца, але, часта, не памятаюць і не могуць уявіць агулам, што гэта быў за музей. А гэта, між іншым, была ўстанова з высокім статусам – музей рамёстваў і народных промыслаў, філіял Дзяржаўнага музея БССР, статусам рэспубліканскага ўзроўню. Існаваў згаданы філіял у мурах Заслаўскай святыні з 1970-х гг. да 1990 г.



Фібула III-IV стст. *

Апрача ўсяго, трэба адзначыць, што гэтая старонка ў гісторыі дадзенага помніка айчыннай архітэктуры стала вызначальнай у яго будучыні. Будынак храма, які шмат гадоў перад тым выкарыстоўваўся ў якасці сховішча для сельскагаспадарчай прадукцыі, было вырашана рэстаўраваць менавіта для таго, каб размясціць у ім музей. Згаданая акалічнасць паспрыяла захаванню дадзенай гісторыка-культурнай каштоўнасці, яе аднаўленню, спыніла працэс разбурэння і занядбання, які, калі меркаваць па фота і мастацкіх выявах 1940-1960-х гг., насамрэч, адбываўся.

Але, вернемся да высокага статуса музея, які быў музеем рэспубліканскага ўзроўню. Чаму? З той нагоды, што ў такога кшталту ўстанове і экспанаты былі адпаведныя, гэта значыць, што ў іх ліку было нямала прадметаў асабліва высокай каштоўнасці як гістарычнай, так і культурнай. Так, напрыклад, раней у Заслаўі можна было пабачыць фібулу III-IV стст. з эмаллю, грабяні X-XIII стст., шахматныя фігуры XII-XIII стст., сярэбраны пазалочаны пацір XVI ст., прадметы драўлянай пластыкі XVII-XIX стст. (скульптурныя кампазіцыі і распяцці), фрагмент і два цэлыя

слуцкія паясы другой паловы XVIII ст. і іншыя надзвычай арыгінальныя музейныя прадметы. На аснове экспазіцый музея рамёстваў і народных промыслаў тысячы жыхароў нашай краіны знаёміліся з традыцыямі нашых продкаў, іх майстравітасцю і руплівасцю, адкрывалі для сябе Беларусь.



Слуцкі пояс другой паловы XVIII ст. *

Пазней, калі было вырашана перадаць будынак праваслаўнай абшчыне, філіял Дзяржаўнага музея БССР вызваліў гэты будынак і перавёз свае экспанаты ў Мінск. Многія з іх можна цяпер пабачыць у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь і мала хто ўжо ведае пра тое, што калісьці яны экспанаваліся ў Заслаўі і менавіта тут для многіх прадметаў пачалося сапраўднае музейнае "жыццё". Гэтая з'ява існавання падобнага кшталту ўстановы ў Заслаўі зрабілася паўзабытай, але яна вартая таго, каб аб ёй згадаць, бо гэта сапраўдная з'ява ў беларускай культуры.

* *Заслаўскі гісторыка-археалагічны запаведнік [Выяўленчы матэрыял] / [аўтары тэксту і складальнікі: І. П. Загрышаў, С. А. Мілючэнкаў. – Мінск : Беларусь, 1983. – 129, [2] с. – [крыніца звестак пра экспанаты і крыніца выяў – рэд.]*

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.